# ПРАДМОВА

Вучэбны дапаможнік адрасуецца навучэнцам устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія рыхтуюць настаўнікаў пачатковай школы.

Беларуская дзіцячая літаратура – гэта частка нацыянальнага прыгожага пісьменства, якая адрозніваецца разнастайнасцю тэматыкі, праблематыкі, жанравых і стылёвых асаблівасцей. Яна мае складаную і цікавую гісторыю развіцця. Аднак прааналізаваць усе асаблівасці беларускай дзіцячай літаратуры ў межах аднаго вучэбнага дапаможніка наўрад ці магчыма па розных прычынах. Пры адборы імёнаў пісьменнікаў і твораў аўтары выдання арыентаваліся на патрабаванні тыпавой вучэбнай праграмы[1].

Змест дапаможніка складаюць манаграфічныя і аглядныя тэмы. Аўтары асобных тэм пашыраюць межы праграмнага матэрыялу, прапаноўваючы характарыстыку пэўных твораў, азнаямленне з якімі можа быць рэкамендавана навучэнцам па іх жаданні.

Пытанні і заданні, змешчаныя пасля кожнай з тэм, скіроўваюць увагу навучэнцаў на паўтарэнне і сістэматызацыю матэрыялу, садзейнічаюць фарміраванню неабходных прафесійных уменняў. Спіс асноўнай і дадатковай літаратуры дапаўняе змест тэм.

Шаноўныя навучэнцы! Пасля азнаямлення з матэрыялам дапаможніка ў вас могуць узнікнуць пытанні для абмеркавання

[1] Тыпавая вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне "Беларуская дзіцячая літаратура" прафесіянальнага кампанента тыпавога вучэбнага плана па спецыяльнасці 2-01 02 01 "Пачатковая адукацыя" для рэалізацыі адукацыйнай праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якая забяспечвае атрыманне кваліфікацыі спецыяліста з сярэдняй спецыяльнай адукацыяй / І.Г. Лабёнак. Мінск, 2014.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

з таварышамі, педагогамі. Значыць, дыялог з кнігай быў карысным і выніковым. У сувязі з гэтым раім спачатку прачытаць (ці перачытаць) адпаведныя літаратурныя творы, суаднесці вашы назіранні, адчуванні, эмоцыі, ацэнкі з той характарыстыкай твораў, якая прапаноўваецца ў вучэбным дапаможніку.

Спадзяёмся, што знаёмства з дзівосным светам беларускай дзіцячай літаратуры не абмяжуецца для вас старонкамі гэтага выдання і вы адкрыеце для сябе яшчэ шмат цікавага і карыснага.

Аўтарамі асобных тэм дапаможніка з'яўляюцца *Алесь Мікалаевіч Макарэвіч* ("Прадмова", "Уступ", "Вусная народная творчасць", "Асаблівасці развіцця беларускай дзіцячай літаратуры ў 20—30-я гады", "Янка Купала", "Янка Маўр", "Сучасныя перыядычныя выданні для навучэнцаў малодшага ўзросту"), *Алесь Іванавіч Бельскі* ("Ніл Гілевіч"), *Таццяна Іванаўна Борбат* ("Зараджэнне беларускай дзіцячай літаратуры", "Алесь Якімовіч", "Алена Васілевіч", "Асаблівасці развіцця беларускай дзіцячай літаратуры на сучасным этапе (паэзія)", "Уладзімір Ліпскі", "Сучасныя перыядычныя выданні для навучэнцаў малодшага ўзросту"), *Інга Дзмітрыеўна Воюш* ("Зараджэнне беларускай дзіцячай літаратуры", "Асаблівасці развіцця беларускай дзіцячай літаратуры на сучасным этапе (паэзія)", "Сучасныя перыядычныя выданні для навучэнцаў малодшага ўзросту"), *Вячаслаў Іванавіч Караткевіч* ("Прадмова", "Уступ", "Вусная народная творчасць", "Асаблівасці развіцця беларускай дзіцячай літаратуры на сучасным этапе (проза, драматургія)"), *Яраслаў Іванавіч Клімуць* ("Асаблівасці развіцця літаратуры для дзяцей у 40—60-я гады. Агульны агляд", "Эдзі Агняцвет", "Агульная характарыстыка беларускай дзіцячай літаратуры 70—80-х гадоў", "Уладзімір Дубоўка"), *Аляксандр Уладзіміравіч Лебедзеў* ("Якуб Колас"), *Вольга Барысаўна Несцяровіч* ("Алена Васілевіч", "Уладзімір Ліпскі"), *Аліна Эдмундаўна Сабуць* ("Рыгор Барадулін"), *Валянцін Мікалаевіч Смаль* ("Максім Танк", "Станіслаў Шушкевіч", "Васіль Вітка", "Павел Місько", "Артур Вольскі"), *Вячаслаў Мікалаевіч Смаль* ("Максім Танк", "Станіслаў Шушкевіч", "Васіль Вітка", "Павел Місько", "Артур Вольскі"), *Алена Васільеўна Шарапава* ("Змітрок Бядуля", "Міхась Лынькоў", "Янка Брыль").



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова